УДК 908

**М.В. Півавар**

# Развіццё дзяржаўнага напрамку гістарычнага краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг.

У працэсе станаўлення Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы надзвычай востра паўстала праблема стварэння і напаўнення адэкватным зместам дзяржаўнай ідэалогіі. Вопыт мінулых гадоў сведчыць, што ў значнай меры гістарычнае краязнаўства выконвала важную ролю сродку выхавання гістарычнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Можна пагадзіцца, што краязнаўства можа ўзяць на сябе сацыяльна значныя функцыі ў выхаванні грамадзянскасці і патрыятызму і на цяперашні момант.

З трох напрамкаў гістарычнага краязнаўства ў БССР – дзяржаўнага, грамадскага, школьнага – асаблівую цікавасць маюць набыткі менавіта дзяржаўнага кірунку, бо дзяржаве належыць галоўная роля ў вызначэнні асноўных прыярытэтаў развіцця краязнаўства, яна мае значныя фінансавыя магчымасці, сістэму арганізацый і ўстаноў, якая з'яўляецца правадніком дзейнасці ў выпрацаваным кірунку.

У айчыннай гістарыяграфіі гэтае пытанне знайшло пэўнае адлюстраванне: у 1980 г. выйшаў дапаможнік «Историческое краеведение Белоруссии» пад рэдакцыяй Э.М. Загарульскага [1], пра развіццё дзяржаўнага кірунку гістарычнага краязнаўства пісалі ў сваіх артыкулах Г.А. Каханоўскі [2], Л. Трэпет [3]. Аднак аўтары спыняліся толькі на разглядзе яго дэфініцыі ці абмяжоўваліся агульным аглядам перспектыў развіцця.

У сувязі з адзначаным, мэтазгодна больш глыбока прааналізаваць развіццё дзяржаўнага гістарычнага краязнаўства ў Беларусі 60–80-х гг. XX ст., калі была створана сістэма краязнаўчай працы і яно дасягнула значных поспехаў. Абагульненне досведу дазволіць убачыць, якія здабыткі і пралікі меліся ў дзяржаўнай палітыцы, якія дасягненні можна выкарыстоўваць на сучасным этапе.

Кіруючая роля ў вызначэнні асноўных прыярытэтаў развіцця гістарычнага краязнаўства належала КПСС. Адной з важных задач, вырашэнне якой прадугледжвалася сродкамі краязнаўства, з'яўлялася выхаванне ў моладзі сацыялістычнага патрыятызму і інтэрнацыяналізму. Ажыццяўлялася яна праз пастановы партыі, якія трансфармаваліся дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з рабочымі дакументамі ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР. Партыйныя і дзяржаўныя органы Беларусі кантралявалі выкананне прынятых рашэнняў праз вывучэнне дзейнасці міністэрстваў і ведамстваў (культуры, народнай асветы, абароны, дзяржаўныя камітэты па справах выдавецтваў, паліграфіі, кніжнага гандлю, дзяржаўныя музеі, інстытуты гісторыі, мастацтвазнаўства і інш.), абласных, гарадскіх і раённых партыйных камітэтаў, абласных, гарадскіх і раённых выканкамаў, уносілі адпаведныя карэктывы ў іх работу.

Ідэалагічнае кіраўніцтва тычылася і грамадскіх арганізацый. Напрыклад, стварэнне рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў – грамадскай арганізацыі, якая выконвала ролю каардынацыйнага цэнтра ў такой сферы краязнаўства, як ахова помнікаў, было ініцыяванае пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19.07.1965 года № 306 «Аб стварэнні Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры».

Старшынямі мясцовых аддзяленняў таварыства ў шэрагу раёнаў з'яўляліся намеснікі старшынь гар- і райвыканкамаў або загадчыкі аддзелаў прапаганды і агітацыі гаркамаў і райкамаў партыі. У склад прэзідыумаў гарадскіх і раённых аддзяленняў таварыства ўваходзілі работнікі аддзелаў прапаганды і агітацыі гарадскіх і раённых камітэтаў партыі і камсамола, супрацоўнікі гарадскіх і раённых аддзелаў культуры і народнай адукацыі, якія дапамагалі і накіроўвалі работу мясцовых аддзяленняў [4].

Адзначым, аднак, што ў пэўных выпадках партыйнае кіраванне вяло да залішняй заарганізаванасці і прыводзіла да фармалізацыі грамадскіх пачынанняў.

Коратка прааналізуем краязнаўчы кампанент дзейнасці дзяржаўных устаноў на працягу 1960–1980-х гг.

Дзяржаўнае краязнаўства ўключае ў сябе працу, якая праводзіцца спецыялізаванымі навуковымі ўстановамі (Інстытут гісторыі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН), рэгіянальнымі дзяржаўнымі і ведамаснымі музеямі, архівамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, бібліятэкамі. Праваднікамі ў ажыццяўленні рэгіянальных даследаванняў і правядзенні ў жыццё іх вынікаў з'яўляюцца дзяржаўныя органы (аддзелы культуры, спорту і турызму, цэнтры рамёстваў), сродкі масавай інфармацыі.

Значная праца краязнаўчай накіраванасці праводзілася структурнымі падраздзяленнямі АН БССР: Інстытутам гісторыі, Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Ва ўсіх рэгіёнах краіны праводзіліся археалагічныя

раскопкі, якія самі па сабе з'яўляліся краязнаўчымі даследаваннямі. У краіне склалася практыка, калі археолагі замацоўваліся за пэўнымі рэгіёнамі і помнікамі, праводзілі іх сістэматычную распрацоўку, што мела важнае значэнне для вывучэння мінулага рэгіёнаў Беларусі.

Напрыклад, даследаваннямі Віцебскай вобласці займаліся – Т.С. Бубенька, Л.У. Калядзінскі, Л.У. Дучыц, В.М. Ляўко, С.В. Тарасаў, М.А. Ткачоў, В.В. Шадыра, Г.В. Штыхаў і інш. У выніку даследаванняў, якія мелі на мэце вывучэнне мінулага Беларусі, былі створаны навуковыя працы па гісторыі асобных гарадоў, рэгіёнаў. У якасці прыкладу прывядзём даследаванні В.М. Ляўко [5] і Г.В. Штыхава [6], якія вывучалі археалагічную спадчыну Віцебшчыны.

На Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) АН БССР была ўскладзена задача стварэння збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. У адпаведнасці з пастановай АН СССР і Міністэрства культуры СССР «Аб падрыхтоўцы «Збору помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР» (1967) у структуры інстытута быў створаны сектар «Збору помнікаў гісторыі і культуры» [7]. Да працы былі далучаны вядучыя навуковыя кадры рэспублікі і з іншых навуковых устаноў: Інстытута гісторыі АН БССР, НДІ «Белспецрэстаўрацыя», дзяржаўных музеяў, ВНУ. Супрацоўнікі сектара праводзілі пастаянныя навуковыя экспедыцыі ў вобласці краіны, прычым да трох штогод.

Сумесна з аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР выдавецтвам «Беларуская савецкая энцыклапедыя» з абласнымі і раённымі аддзяленнямі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК), на якія таксама ўскладаліся абавязкі па збору матэрыялаў да выдання, былі створаны спісы, апісанні, праведзены фіксацыя і абмеры помнікаў гісторыі культуры.

У 1988 г. з'явілася апошняя кніга 7-томнага выдання «Збору», якое змяшчала больш за 14 тысяч артыкулаў пра нерухомую гісторыка-культурную спадчыну Беларусі. Праца над зводам помнікаў рэспублікі была высока ацэнена ўрадам краіны. Калектыву была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР.

Адметнай падзеяй краязнаўчай накіраванасці стала падрыхтоўка і выданне гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Разам з інстытутамі АН БССР значную ролю ў стварэнні серыі адыгралі дзяржаўныя органы. Кіраўніцтва падрыхтоўкай і выданнем кніг «Памяць» ажыццяўлялася раённымі і гарадскімі камісіямі на чале з сакратарамі райкамаў і гаркамаў КПБ. Апрацоўкай матэрыялаў кніг і падрыхтоўкай іх да друку займаліся аддзелы культуры гар- і райвыканкамаў, аддзелы прапаганды і агітацыі партыйных камітэтаў, выкладчыкі ВНУ, навукоўцы з Інстытута гісторыі, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Кнігі серыі з'яўляюцца сапраўднымі хронікамі жыцця раёна, утрымліваюць багаты краязнаўчы матэрыял па ўсіх перыядах гісторыі кожнага рэгіёна. Да 2006 года былі выдадзены ўсе з запланаваных 140 тамоў гэтай серыі.

На працягу 1960–1980-х гг. асобнымі навукоўцамі ствараліся комплексныя працы і манаграфіі, якія насілі рэгіянальны характар. Значная колькасць такіх прац была прысвечана помнікам гісторыі і культуры асобных гарадоў і абласцей БССР. Менавіта вучоныя сталі аўтарамі гісторыка-эканамічных нарысаў пра гарады і раёны Беларусі. Шэрагам вядомых гісторыкаў былі напісаны і выдадзены кнігі, у якіх на высокім навуковым узроўні аналізаваліся гісторыя, культура мясцовасці, дзе нарадзіўся і вырас даследчык. У якасці прыкладу можна спаслацца на працы У.М. Кісялёва, А. Мальдзіса [8].

Дзяржаўныя *краязнаўчыя музеі* былі арганізуючымі і каардынуючымі цэнтрамі краязнаўчых даследаванняў у рэгіёнах краіны. Галоўным напрамкам

дзейнасці рэгіянальных гісторыка-краязнаўчых музеяў з'яўлялася правядзенне даследаванняў у пэўнай мясцовасці: праца па *збіранні* рэчавых і пісьмовых крыніц, *распрацоўка экспазіцый*, якія адлюстроўвалі жыццё рэгіёну, *навукова-асветніцкая* дзейнасць па гісторыі савецкага грамадства.

На працягу 1960–1980-х гг. назіралася агульнае пашырэнне музейнай сеткі, паляпшэнне якасці іх экспазіцый, што сведчыла аб узрастанні грамадскай актыўнасці насельніцтва і яго цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, на 1960 г. у сістэме Міністэрства культуры БССР было 42 музеі, а на пачатку 1991 г. – 141 музей. Гэта значыць, што на працягу 30 гадоў у краіне было адчынена амаль 100 музеяў. Найбольш шматлікая (каля 80%) профільная група дзяржаўных музеяў БССР мела краязнаўчы кірунак [9].

Вялікая праца па вывучэнні гісторыі і культуры роднага краю праводзілася гістарычнымі факультэтамі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Менавіта тут меліся кваліфікаваны выкладчыцкі састаў, навуковыя кадры, студэнты, якія займаліся гістарычнымі даследаваннямі, выкарыстоўваючы, у першую чаргу, мясцовы (г.зн. краязнаўчы) матэрыял.

Адзначым, што на ўсіх гістфаках выкладаўся прадмет «Гістарычнае краязнаўства». Летам, разам з музейнай і археалагічнай, студэнты праводзілі трохтыднёвую краязнаўчую практыку, у ходзе якой вывучалі гісторыю, геаграфію, помнікі гісторыі і культуры асобных рэгіёнаў Беларусі і сумежных рэспублік СССР.

У Гродзенскім педінстытуце (з 1977 г. універсітэце) на працягу дзесяткаў гадоў пры кафедры гісторыі БССР працаваў студэнцкі гісторыка-краязнаўчы гурток. Члены гуртка даследавалі гісторыю заводаў і фабрык Гродзеншчыны; праводзілі абагульненне перадавога вопыту работы школьных гісторыка-краязнаўчых гурткоў і музеяў; рабілі апісанне і вывучэнне выяўленых помнікаў гісторыі і культуры краю і выкарыстоўвалі гэтыя матэрыялы ў рабоце па прапагандзе ведаў пра гісторыка-культурную спадчыну [10].

Значную ролю ў краязнаўчым даследаванні Гомельшчыны адыгрываў гістарычны факультэт Гомельскага універсітэта (з 1969 г.). Варта прыгадаць тэмы курсавых і дыпломных работ, якія абараняліся на факультэце: «Першыя рэвалюцыянеры Гомельшчыны, якія сустракаліся з Леніным», «Пра вайсковыя часці, вызваляўшыя гарады і раёны Гомельшчыны», «Партыйнае падполле і партызанскія стаянкі на тэрыторыі раёнаў Гомельшчыны» [11]. У 1980 г. па ініцыятыве гісторыкаў ва універсітэце быў створаны археолага-этнаграфічны музей.

У фондах дзяржаўных абласных і занальных архіваў захоўваюцца каштоўныя і цікавейшыя неапублікаваныя дакументы, у тым ліку і краязнаўчага характару. На працягу 1960–1980-х гг. асноўнай формай краязнаўчай навуковай дзейнасці архіваў была публікацыя артыкулаў па гісторыі краю, падрыхтоўка перадач для сродкаў масавай інфармацыі. Напрыклад, дырэктар дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВВ) К.М. Коласаў з 1958 па 1977 г. з'яўляўся аўтарам больш за 75 артыкулаў у мясцовым перыядычным друку [12]. З удзелам супрацоўнікаў Віцебскага абласнога архіва на працягу 1960 – сярэдзіны 1970-х гг. былі падрыхтаваны і праведзены 20 радыё- і 30 тэлеперадач, у якіх асвятляліся розныя аспекты гісторыі Віцебшчыны.

Асветніцкая, публікатарская дзейнасць архіваў (спашлёмся на аналіз працы архіваў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей) у 60–70-я гг. XX ст. мела, галоўным чынам, «хвалепадобны» характар і ў асноўным прымяркоўвалася да святкавання юбілейных дат у гісторыі КПБ–КПСС, ЛКСМБ, Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі народнай гаспадаркі і асобных прадпрыемстваў.

Пэўныя змены назіраюцца з сярэдзіны 1980-х гг. З актывізацыяй грамадскага жыцця ў краіне, зняццем пэўных ідэалагічных абмежаванняў, пашырэннем тэматыкі даследаванняў набыло актуальнасць правядзенне краязнаўчых канферэнцый, прысвечаных розным тэмам жыцця краіны.

У Віцебску, напрыклад, у 1987 г. праводзілася навукова-практычная канферэнцыя «Некоторые вопросы истории Витебской областной партийной организации». Да яе правядзення былі падрыхтавана выстава, арганізаваны перадачы на радыё і тэлебачанні, выдадзены камплект плакатаў.

Значная праца па вывучэнні рэгіёнаў ажыццяўлялася ў абласных, гарадскіх і раённых бібліятэках краіны. У 1960-я гады ў абласных бібліятэках былі створаны аддзелы беларускай і краязнаўчай літаратуры. Пазней яны былі рэарганізаваны ў аддзелы краязнаўства і бібліяграфіі. У іх абавязкі, акрамя іншага, уваходзіла складанне рэкамендацыйных спісаў па гісторыі рэгіёну, пра розныя бакі жыцця краю. Напрыклад, на працягу 1960–1980-х гг. супрацоўнікамі аддзела Віцебскай абласной бібліятэкі была праведзена вялікая праца па складанні бібліяграфіі Віцебшчыны. За гэты перыяд былі надрукаваны 22 выданні: бібліяграфічных паказальнікаў, рэкамендацыйных спісаў літаратуры, лекцый, метадычных парад у дапамогу чытачам і бібліятэкам.

Вынікі краязнаўчых даследаванняў як навуковага, так грамадскага і школьнага напрамкаў знаходзілі адлюстраванне ў сродках масавай інфармацыі. Штатныя супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання вялі распрацоўку краязнаўчай тэматыкі, дапамагалі мясцовым краязнаўцам у падрыхтоўцы іх матэрыялаў да друку. Напрыклад, журналіст А.М. Падліпскі, які працаваў у віцебскіх выданнях «Строитель», «Народнае слова» ў 1960–1990-я гг., падрыхтаваў больш за 800 артыкулаў, прысвечаных гісторыі і культуры Прыдзвіння [13].

Абагульняючы, адзначым, што на працягу 1960–1980-х гадоў найбольшае значэнне ў гістарычным краязнаўстве Беларусі меў дзяржаўны кірунак, у развіццё якога важны ўклад быў унесены навуковымі ўстановамі, дзяржаўнымі і ведамаснымі музеямі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, архівамі, бібліятэкамі, сродкамі масавай інфармацыі, іншымі дзяржаўнымі ўстановамі.

Інстытуты гісторыі, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору з'яўляліся арганізуючымі і метадычнымі цэнтрамі, якія ажыццяўлялі кваліфікаваную навуковую дапамогу па пэўных пытаннях гісторыі і культуры як дзяржаўным органам, так і грамадскім арганізацыям.

На працягу 1960–1980-х гг. значна павялічылася колькасць дзяржаўных гісторыка-краязнаўчых музеяў і якасць іх экспазіцый. Музеі сталі арганізуючымі і каардынуючымі цэнтрамі краязнаўчых даследаванняў у рэгіёнах краіны, забяспечвалі збор інфармацыі па гісторыі і культуры краю, яе захаванне і выкарыстанне ў мэтах выхавання насельніцтва.

Крыніцазнаўчую базу для правядзення краязнаўчых даследаванняў забяспечвалі архівы БССР, якія на аснове выяўленых дакументаў праводзілі важную асветніцкую дзейнасць у мясцовым і рэспубліканскім друку.

Значная роля ў развіцці гістарычнага краязнаўства належала вышэйшым навучальным установам. Краязнаўчыя аддзелы абласных бібліятэк Беларусі займаліся бібліяграфічнай, асветніцкай, працай, што, безумоўна, садзейнічала развіццю рэгіянальных даследаванняў.

Развіццё дзяржаўнага напрамку гістарычнага краязнаўства садзейнічала выкананню патрабаванняў партыі і ўрада ў галіне ідэалогіі і культуры, развіцця гістарычнай навукі, выхаванню ў грамадзян савецкага патрыятызму, гістарычнай свядомасці.

Атрыманыя вынікі сведчаць пра тое, што дзяржаўная палітыка ў сферы гістарычнага краязнаўства спрыяла развіццю ведаў пра край, выхаванню

ў грамадзян краіны патрыятызму і грамадзянскіх якасцей. Бачыцца мэтазгодным працяг фінансавання праектаў, звязаных з рэгіянальнымі даследаваннямі, асабліва ў сістэме культуры і адукацыі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Историческое краеведение Белоруссии*** / под ред. ***Э.М. Загорульского***. – Мн.: Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – 263 с.
2. ***Каханоўскі, Г.А.*** Беларускае краязнаўчае таварыства / ***Г.А. Каханоўскі*** // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 81; ***Каханоўскі, Г.А.*** Краязнаўства / ***Г.А. Каханоўскі*** // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / гал. рэд. ***І.П. Шамякін***. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 123.
3. ***Трэпет, Л.*** Краязнаўства / ***Л. Трэпет*** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. – Мн.: БелЭн, 1998. – С. 257–260.
4. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці***. Ф. 487. – Воп. 1. – Спр. 128. Арк. 12. Списки исторических памятников, расположенных на территории области (1976).
5. ***Левко, О.Н.*** Витебские изразцы XIV–XVIII вв. / ***О.Н. Левко***. – Мн.: Полымя, 1981. – 46 с.; ***Левко, О.Н.*** Витебск XIV–XVIII вв. / ***О.Н. Левко***. – Мн.: Наука и техника, 1984. – 120 с.; Экскурсия по древнему Витебску / ***О.Н. Левко***. – Мн.: Полымя, 1984. – 32 с.; ***Левко, О.Н.*** Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. / ***О.Н. Левко***. – Мн.: Наука и техника, 1989. – 88 с.
6. ***Штыхов, Г.В.*** Древний Полоцк IX–XIII вв. / ***Г.В. Штыхов***. – Мн.; Наука и техника, 1975. – 135 с.; ***Штыхов, Г.В.*** Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / ***Г.В. Штыхов***. – Мн.: Наука и техника, 1978. – 159 с.; ***Штыхаў, Г.В.*** Ажываюць сівыя стагоддзі / ***Г.В. Штыхаў***. – Мн.: Народная асвета, 1982. – 175 с.
7. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці***. Ф. 487. – Воп. 1. – Спр. 31. Арк. 32–33. Постановления и распоряжения президиума ЦС БДООПиК за 1970 г.
8. ***Киселев, В.Н.*** На истоках неманских / ***В.Н. Киселев***. – Мн.: «Полымя», 1985. – 112 с.; ***Мальдзіс, А.*** Астравеччына, край дарагі... / ***А. Мальдзіс***. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1977. – 207 с.
9. ***Гужалоўскі, А.А.*** Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / ***А.А. Гужалоўскі***. – Мн.: НАРБ, 2004. – 218 с.
10. ***Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці***. Ф. 245. – Воп. 1. – Спр. 51. Протоколы заседаний историко-краеведческого кружка 1971–1975; ДАГВ.
11. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь***. Ф. 492. – Воп. 1. – Спр. 22. Арк. 24. Постановления и распоряжения президиума РС БДООПиК.
12. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці***. Ф. 289. – Воп. 1-к. – Спр. 90. Личное дело К.М. Колосова.
13. ***Аркадий Михайлович Подлипский. Библиография основных публикаций 1968–2005 гг.*** / сост. ***А.М. Подлипский***, ***В. Рогач***. – Витебск: ГУ «ВОБ им. В.И. Ленина», 2006. – 78 с.



*SUMMARY*

*The article is devoted to the problem of development of state direction of historical local lore of Belarus. Analyzed the main form and results of activities in 1961–1991 years.*



*Поступил в редакцию 5.12.2006*